беларускую і замежную літаратуру. Вядомы беларускі мовазнаўца Лявон Баршчэўскі правёў майстар-клас па мастацтве перакладу для студэнтаў, адказаў на пытанні студэнтаў і выкладчыкаў. У сустрэчы прынялі ўдзел літаратар Усевалад Сцебурака, спявак і мастак Андрусь Такінданг, а таксама дарадца амбасадара Швецыі ў Беларусі Алеся Літвіноўская.

У ходзе правядзення штогадовага Фестывалю беларускага слова ў Цэнтры арганізоўваецца "Дзень адчыненых дзвярэй" для школьнікаў. Сябры Цэнтра прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні свята беларускай культуры. На працягу двух апошніх гадоў пры Цэнтры працуе клуб беларускамоўнай камунікацыі "Размаўляй-ка", дзе ўсе ахвотныя могуць удасканаліць свае маўленчыя навыкі, практыку суразмоўніцтва па-беларуску. Заняткі ў клубе наведваюць студэнты іншых факультэтаў, а таксама ахвотныя з іншых навучальных устаноў горада.

У межах тыдня да Міжнароднага дня роднай мовы штогод на факультэце праводзіцца конкурс праектаў "Мой зямляк у сусветнай культуры" (праекты пра М. Нікіфароўскага, Р. Барадуліна, М. Фрадкіна, М. Савіцкага, І. Хруцкага, С. Алексіевіч); агульнанацыянальная дыктоўка па беларускай мове ў Віцебскай абласной бібліятэцы з удзелам выкладчыкаў, студэнтаў філалагічнага факультэта і прадстаўнікоў грамадскасці горада.

Такім чынам, усебаковая праца выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава спрыяе вырашэнню нашай агульнай мэты – данесці родную мову да кожнага, хто яшчэ не далучыўся да беларускага слова.

(Работа выканана пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў).

Ю.А. Пераверзева (Мінск)

РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў НАВУЧАННІ І ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛІЁГРАФАЎ

Бібліятэкі як складнікі інфармацыйна-камунікатыўнай прасторы беларускага грамадства забяспечваюць свабодны доступ насельніцтва краіны да друкаваных і электронных нацыянальных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў, арганізуюць бытаванне рэчыўнай і духоўнай культуры беларусаў у сацыякультурным асяроддзі. У практычнай дзейнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў беларуская мова з'яўляецца сродкам прафесійных зносін і мае даволі распаўсюджанае бытаванне. Яна ўжываецца пры індывідуальным абслугоўванні карыстальнікаў, а таксама пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, культурных акцый кшталту прэзентацый новых кніг, літаратурных вечарын, паэтычных гасцёўняў і

Репозиторий ВГУ

інш.; фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў; ажыццяўленні навукова-даследчай работы; аказанні калегам метадычнай і кансультацыйнай дапамогі.

Спецыфіка бібліятэчнай працы абумоўліваецца тым, што бібліятэкары-бібліёграфы ўступаюць у прафесійна-асобасную камунікацыю як паміж сабой, так і з карыстальнікамі. Да таго ж яны арганізуюць дыялог паміж наведвальнікамі бібліятэкі і апасродкаванае ўзаемадзеянне карыстальнікаў інфармацыі з дакументамі розных тыпаў, відаў, жанраў, дзе асобна трэба выдзеліць нацыянальныя дакументы, якія выдаюцца пераважна на беларускай мове.

Змест і спосабы працы сучасных бібліятэкараў-бібліёграфаў усё больш падпадаюць пад уздзеянне лічбавых тэхналогій, што толькі пашырае камунікатыўныя межы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Гэта выражаецца ў штодзённым выкарыстанні найноўшых інфармацыйна-пошукавых сістэм, баз даных, размеркаванні інфармацыйных патокаў, прымяненні аналітычных, тэхналагічных уменняў пры стварэнні тэматычных, персанальных і іншых мультымедыйных інфармацыйных рэсурсаў, наяўнасці навыкаў прадстаўлення бібліятэкі ў віртуальнай прасторы, мабільных сэрвісах. Зразумела, што такая камунікацыя не будзе паўнацэннай без ведання супрацоўнікамі бібліятэкі правіл, нормаў ужывання новай, раней мала распаўсюджанай, тэрміналогіі па-беларуску, выражэння думак на роднай мове ў вуснай і пісьмовай формах з выкарыстаннем разнастайных моўных стыляў і сродкаў іх рэалізацыі. Такім чынам, нельга не пагадзіцца з высновай, што “камунікатыўная кампетэнцыя забяспечвае паспяховасць ажыццяўлення асноўных задач зносінаў і самарэалізацыі асобы і выражаецца ў валоданні лінгвістычнымі ўменнямі, прытрымліванні спецыфічных сацыяльна-культурных норм маўленчых паводзінаў” [4, с. 182], а для таго, “каб мова для чалавека стала надзейным і гнуткім інструментам камунікацыі, неабходна ведаць будову і правілы яе функцыянавання” [4, с. 183].

Станоўчым лічым, што вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, якая выкладаецца студэнтам спецыяльнасці “бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць” Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, скіравана на набыццё будучымі бібліятэкарамі-бібліёграфамі ведаў у галіне беларускага мовазнаўства і фарміравання ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных філалагічных задач [1], што з’яўляецца важнейшай умовай эфектыўнай і якаснай прафесійнай дзейнасці, канкурэнтаздольнасці спецыяліста на працоўным рынку. Нягледзячы на моўную падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў ва ўстанове выйшэйшай адукацыі і наяўнасць моўнага асяроддзя ў бібліятэках, адчуваецца патрэба пастаяннага ўдасканальвання

Репозиторий ВГУ

як прафесійнай лексікі, у тым ліку назваў спецыяльных паняццяў, характэрных для бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства, інфарматыкі, так і нормаў маўлення, звязаных з іншымі відамі і галінамі жыццядзейнасці грамадства.

Моўная падрыхтоўка – складнік камунікатыўнай кампетэнцыі студэнта, далей – бібліятэчнага спецыяліста-практыка, паказчык асобаснай і прафесійнай культуры. У бібліятэках у пэўных сітуацыях зносінаў адбываецца самавыражэнне асобы работніка, які ўсё часцей становіцца ўдзельнікам публічных прафесійных дыскусій, у тым ліку на беларускай мове. Гэта значыць, што для бібліятэкара-бібліёграфа не павінны быць праблемнымі прымяненне пры размове прафесіянальных слоў / выразаў ці, напрыклад, праца са спецыяльнымі галіновымі, вузкапрафесіянальнымі дакументамі, падрыхтоўка аўтарскіх тэкстаў артыкулаў, дакладаў, даведак. З мэтай папулярызацыі выкарыстання беларускай мовы ў прафесійным ужытку і навучання беларускай мове небеларускамоўных супрацоўнікаў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі функцыянуе клуб “Размаўляй.by”.

Як носьбіт мовы бібліятэкар-бібліёграф павінен максімальна валодаць моўнымі сродкамі, неабходнымі для трансляцыі інфармацыі, разумення і інтэрпрэтацыі кантэксту інфармацыйных крыніц. Гэтаму будзе садзейнічаць фарміраванне ў студэнтаў і ў спецыялістаў-практыкаў моўнай, сацыялінгвістычнай, лінгвакультуралагічнай кампетэнцый, якія вылучаны ў практыцы навучання мовам [2]. Таксама было б лагічным, каб студэнтам спецыяльнасці “бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць”, слухачам курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, выкладаліся вучэбныя дысцыпліны, якія накіраваны на развіццё культуры прафесійнага маўлення: “Беларуская мова і культура маўлення”, “Дзелавое маўленне (пісьмовае і вуснае)”, “Маўленчы этыкет” і інш. Дарэчы, у расійскіх установах вышэйшай адукацыі студэнтам на выбар прапануюцца курсы “Стылістыка”, “Рыторыка”, “Пісьмовае маўленне” [3]. Выкладанне падобных дысцыплін, звязаных з вывучэннем роднай мовы, не будзе лішнім для студэнтаў бібліятэчнай спецыяльнасці, бо на практыцы, у пэўных функцыянальных абставінах, спецыялісту неабходна валодаць лексікай агульнавуковага, афіцыйна-справавога, публіцыстычнага, мастацкага, гутарковага ўжывання. Вельмі добра, што прафесарска-выкладчыцкім складам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў падрыхтаваны (надрукаваны, задэпаніраваны) вучэбныя матэрыялы па спецыяльнасці “бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць” на беларускай мове. Сярод іх вучэбныя дапаможнікі “Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк” (Л.А. Дзямешка, С.А. Паўлава), “Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк” (Ю.А. Пераверзева), “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці” (С.В. Зыгмантовіч), “Сацыялогія і

Репозиторий ВГУ

псіхалогія чытання” (Н.У. Клімянкова), “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” (Т.В. Кузьмініч) і г. д.

Развіццю беларускамоўных прафесійных адносінаў паміж супрацоўнікамі бібліятэк спрыяюць таксама перыядычныя выданні “Бібліятэчны свет”, “Бібліятэка прапануе”, “Новыя кнігі”, навуковы зборнік артыкулаў “Бібліятэчны веснік”.

Асобна трэба адзначыць падручнікі па беларускай мове, аўтарамі якіх з’яўляюцца А.М. Пісарэнка (А.М. Багамолава), Г.К. Семянькова, В.А. Гуліцкая, якія складаюць базіс для вывучэння мовы і ўдасканалення камунікатыўных якасцяў маўлення спецыялістаў розных накірункаў бібліятэчна-інфармацыйнай справы.

Увогуле, непарыўнасць вывучэння ўнармаванай, апрацаванай майстрамі слова сучаснай беларускай літаратурнай мовы, яе паходжання, развіцця, месца сярод іншых моў свету, асаблівасцей функцыянавання [3] і бесперапыннасць аднаўлення ведаў па раздзелах лінгвістыкі бібліятэкарамі-бібліёграфамі будзе спрыяць захаванню нацыянальнай спадчыны, прапагандзе лепшых твораў друку, знаёмству грамадскасці з выданнямі айчынных аўтараў.

Літаратура

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка) : вучэбная праграма [Электронны рэсурс] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: А.М. Пісарэнка, В.А. Гуліцкая, В.В. Шунейка. – Мінск, 2018. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/19294. – Дата доступу: 08.08.2019.

2. Николаенко, С.В. Основные подходы и требования к развитию компетенций взрослых при обучении их иностранным языкам [Электронный ресурс] / С.В. Николаенко // Дополнительное образование взрослых: перспективы развития и инновации : материалы респ. науч.-практ. конф., Витебск, 22 нояб. 2012 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А. П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2012. – Режим доступа: https://lib.vsu.by/xmlui/handle/123456789/16007. – Дата доступа: 12.09.2019.

3. Пісарэнка, А.М. У абарону стылістыкі і культуры прафесійнага маўлення ў межах прадмета “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” [Электронны рэсурс] / А.М. Пісарэнка, В.В. Шунейка // Теория и практика преподавания лингвистических дисциплин в вузах негуманитарного профиля : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 175-летию УО «БГСХА» и 40-летию кафедры русского и белорусского языков, Горки, 10–11 июня 2015 г. / Белорус. гос. с.-х. акад. – Горки, 2015. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/16582/. – Дата доступу: 09.08.2019.

4. Шунейка, В.В. Лінгвістычная падрыхтоўка будучага спецыяліста-бібліятэкара / В.В. Шунейка // Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23 кастр. 2014 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Яцэвіч (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2015. – С. 181–185.

Репозиторий ВГУ